№ 2 (147)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Студзень 2013 г.

У БЯЛЫНІЧАХ ШМАТДЗЕТНЫЯ СЕМ'І ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ УЛАСНАГА ЖЫЛЛЯ?

У Бялыніцкім раёне бацькі шматдзетных сем'яў апынуліся у вельмі складанай сітуацыі з-за непрадуманых дзеянняў беларускіх уладаў і мясцовых чыноўнікаў.



Справа ў тым, што ў гарадскім пасёлку Бялынічы Магілёўскай вобласці мясцовыя ўлады выставілі шматдзетным сем'ям такія кошты на будаўніцтва ільготнага жылля, што яны могуць застацца без кватэр да глыбокай старасці. Між тым улады Рэспублікі Беларусь дэкларуюць пастаянны клопат пра шматдзетныя сем'і і з імпэтам распавядаюць пра тое, як шмат яны робяць для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі ў краіне.

"Яшчэ 2 сакавіка 2012 года нас, бацькоў шматдзетных сем'яў, сабралі ў Бялыніцкім райвыканкаме і прапанавалі аб'яднацца ў адзін жыллёва-будаўнічы кааператыў, дом для якога паабяцалі пабудаваць быстра і якасна, – распавядае старшыня ЖБК "Дванаццаць", бацька траіх дзяцей Пётр Шымбалёў. – Дом на дванаццаць кватэр для шматдзетных сем'яў у Бялынічах паабяцалі здаць у эксплуатацыю ўжо ў снежні 2012 года, таму шматдзетныя сем'і вельмі хутка падрыхтавалі неабходныя дакументы, каб адразу ж пачалося будаўніцтва. Аднак пасля працэс афармлення кааператыва і пачатак будаўніцтва былі адкладзеныя, як нам неафіцыйна патлумачылі, у сувязі з тым, што ўсе будаўнічыя магутнасці задзейнічаны на падрыхтоўцы да "Дажынак" у Горках. У выніку, замест таго каб засяліцца ў новы дом у снежні, угэтым месяцы толькі пачалі закладваць фундамент дома для шматдзетных сем'яў у Бялынічах".

Па словах Пятра Шымбалёва,

(Пачатак. Працяг на стар. 2)

КАК НАС УЧАТ БЕРЕЖЛИВОСТИ

** «В Год бережливости мы должны научиться многому» - газета «Советская Белоруссия»*

2013 год провозглашён Годом бережливости. Таким незамысловатым способом нам объявили о том, что отныне нужно быть бережливыми и экономными. То есть, затянуть пояса и считать каждую копейку. За этот год по уверению главной президентской газеты «мы должны научиться многому». А чему же белорусских граждан учили всё это время?

Легко убедиться в том, что тема экономии и бережливости зазвучала в выступлениях Лукашенко ещё больше десяти лет назад. Тогда он находился в состоянии выбора — начать серьёзные структурные реформы экономики или одолжить миллиардные кредиты, которые охотно готовы были давать и Запад и Россия. Как мы сейчас хорошо знаем, победило желание пожить в долг, видимо, подкреплённое надеждой, что всё какнибудь образуется. С Россией, мол, всегда сумеем договориться, а всем прочим объясним, что лучше не соваться в дела суверенного государства.

В страну потекли финансовые реки, что позволило не обращать внимания на расточительность и убытки так и не реформированной экономики. Внешне всё выглядело прекрасно, ведь производственные показатели росли, доходы населения повышались, а валютные котировки интересовали людей меньше, чем прогноз погоды. Но первые тревожные звоночки зазвучали задолго до объявления Года бережливости. В ноябре 2003-го состоялось совещание по вопросам обеспечения надёжной работы энергетического комплекса страны. На нём открыто

(Начало. Оконч. на стр. 3)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

У БЯЛЫНІЧАХ ШМАТДЗЕТНЫЯ СЕМ'І ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ УЛАСНАГА ЖЫЛЛЯ?

(Працяг. Пачатак на стар. 1)

асноўныя выпрабаванні для шматдзетных бацькоў былі наперадзе.

“Першапачаткова быў распрацаваны праект будаўніцтва 12 кватэрнага жылога дома ПЖСК “Дванаццаць” для шматдзетных сем'яў, які прадугледжаў агульны каштарысны кошт будаўніцтва ў памеры 7 364 742 тысячы рублёў, прычым многія спецыялісты лічылі такі кошт нашмат завышаным, – кажа Пётр Шымбалёў. – Згодна праекту, зацверджаны кошт 1 метра квадратнага агульнай плошчы кватэр, яшчэ раз падкрэсліваю – ільготных, для шматдзетных сем'яў, – складаў 6 723,187 тысяч рублёў. Аднак мы былі вымушаныя пагадзіцца на гэтыя ўмовы, бо на вуліцы ж жыць не будзеш, а дзяржава абяцала сем'ям, якія маюць чатырох і болей дзяцей, пабудаваць кватэры цалкам за кошт ільготных крэдзітаў. Тым жа сем'ям, што маюць трох дзяцей, за кошт ільготнага крэдзітавання пагашалась 75% ад кошту будаўніцтва жылля”.

Якое ж было здзіўленне шматдзетных бацькоў, калі 5 студзеня 2013 года іх сабралі ў зале паседжанняў Бялыніцкага райвыканкама, каб паведаміць пра тое, што яны павінны найсці яшчэ процьму грошай, каб працягнуць будаўніцтва.

“Спачатку нам распавялі пра тое, што ў сувязі з пераносам тэрмінаў будаўніцтва ўнесены змены ў каштарысны кошт будаўніцтва, ён павялічаны на 1 865 034 тысячы рублёў і зараз складае 9 229 776 тысяч рублёў. Пасля паведамілі яшчэ адну “прыемную навіну” –згодна з пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 лістапада 2012 г. № 1023 “Аб мерах па выкананню заданняў на 2013 год па будаўніцтву жылых дамоў” зацверджаны “паказчыкі кошту будаўніцтва 1 кв. метра агульнай плошчы жылога памяшкання тыпавых якасцяў для разліку памеру ільготных крэдытаў і аднаразавых субсідый на будаўніцтва (рэканструцыю) ці набыццё жылых памяшканняў у памерах, не перавышаючых 4,6 млн. рублёў”. Калі сказаць прасцей, як патлумачылі нам райвыканкамаўскія і банкаўскія чыноўнікі, зараз дзяржава будзе датаваць для шматдзетных сем'яў будаўніцтва 1 кв м жылля на суму, не большую за 4,6 млн. рублёў, суму, якая перавышае гэты кошт, мы павінны аплочваць самі са сваёй кішэні.



Для ўсіх нас гэта проста шок, бо зараз кошт 1 кв м жылля ў нашым ільготным доме выходзіць у памеры 7 994,806 тысяч рублёў, прычым усе тое, што перавышае 4,6 млн. рублёў за 1 кв м нам прапанавалі аплочваць за кошт уласных сродкаў. Самае смешнае, што мне і іншым зараз патрэбна даплаціць за будаўніцтва 1 кв м большую суму, чым плацяць наогул за квадратны метр у іншым кааператыве ў Бялынічах, які дабудоўвае дом у Бялынічах без усялякай дэкларававанай “падтрымкі шматдзетных сем'яў”. Канешне, мы будзем спрабаваць дабіцца нейкай справядлівасці, бо, калі не знойдзем нейкай падтрымкі, мы вымушаны будзем проста адмовіцца ад будаўніцтва жылля. Дзесьці знайсці і даплаціць такія шалёныя грошы для нас проста не рэальна. Дарэчы, для нас абсалютна незразумела, адкуль атрымаўся такі кошт 1 кв м у нашым доме, за такія грошы можна пабудаваць жыллё пад Мінскам. Няхай пабудуюць нам дом па кошту 4,6 млн. рублёў за 1 кв м, нехта ж у Саўміне гэтыя кошты рэальна разлічваў, мы будзем толькі “за”, – кажа Пётр Шымбалёў.

Па словах Пятра Шымбалёва, шматдзетныя сем'і пачалі звяртацца за дапамогай у розныя інстанцыі, аднак ніякага станоўчага выніку дамагчыся не змаглі.

“Асабіста я тэлефанаваў у КДК, адміністрацыю прэзідэнта, на “Гарачую лінію” АНТ, хадзіў на прыём да старшыні Бялыніцкага райвыканкама Аляксандра Вароніна. У адміністрацыі прэзідэнта нейкая дзяўчына наогул мяне “адфутболіла”, супрацоўнікі магілёўскага КДК параілі шукаць іншы кааператыў, што наогул для Бялыніч смешна, якія тут іншыя кааператывы, на АНТ сказалі, што іх карэспандэнт звяжацца са мной пазней. Старшыня райвыканкама паабяцаў, што напіша зварот у Магілёўскі аблвыканкам, каб далі тлумачэнні, што рабіць з будаўніцтвам жылля для мнагадзетных сем'яў далей. Іншыя члены нашага кааператыва таксама звярталісь у розныя інстанцыі, выніку ніякага, нават размаўляць не хочуць. Не разумею, навошта тады чыноўнікам казаць прыгожыя словы пра дапамогу шматдзетным сем'ям,

(Заканчэнне на стар. 3)

У БЯЛЫНІЧАХ ШМАТДЗЕТНЫЯ СЕМ'І ЗАСТАНУЦЦА БЕЗ УЛАСНАГА ЖЫЛЛЯ?

(Заканч. Пачатак на стар.1, 2)



калі нас проста фактычна заганяюць у тупік. Усе мы людзі небагатыя і не знойдзем па некалькі дзесяткаў тысяч долараў, каб заплаціць за кватэры. Крэдыт нам у банку таксама не дадуць на такія сумы, бо там трэба, каб былі вельмі высокія заробкі, а адкуль яны ў Бялынічах. Мы ж і нашы дзеці не вінаватыя ў тым, што "Дажынкі" палічылі важнейшым за жыллё для шматдзетных сем'яў і змянілі ўмовы ільготнага крэдытавання ў краіне ўжо пасля таго, як мы аб'ядналіся ў кааператыў і пачалі будаваць дом".

Зараз шматдзетныя бацькі праводзяць кансультацыі з кваліфікаванымі юрыстамі, каб вызначыцца, якім чынам можна вырашыць узнікшую праблему.

Мне асабіста вельмі сумна, што словы кіраўніка краіны, які асабіста не раз заяўляў пра неймаверную падтрымку шматдзетных сем'яў у Беларусі, зноў аказаліся проста прыгожымі словамі. На сам рэч людзі застаюцца сам на сам са сваімі праблемамі, таму, магчыма, і скарачаецца з кожным годам насельніцтва нашай краіны, не гледзячы на разнастайныя праграмы па "дэмаграфічнай бяспекі".

Канешне, лепш жа паклапаціцца пра нашых самых працавітых у свеце чыноўніках, у якіх, бедненькіх, "недопустимо низкая зарплата". Магчыма, у шалашах, бедалагі, хутка жыць будуць, а не ў шыкоўных катэджах. Ну а шматдзетныя сем'і няхай самі выжываюць…

Іван Барысаў

КАК НАС УЧАТ БЕРЕЖЛИВОСТИ

(Оконч. Начало на стр. 1)

заговорили о необходимости «научиться экономить, как, к примеру, в Германии». Это касалось не только предприятий, даже простым гражданам рекомендовалось «принять соответствующие меры, если они хотят сократить расходы на отопление: необходимо привести в порядок и утеплить своё жилище». Обращаясь к управленцам и чиновникам, Лукашенко подытожил: «Пора выходить из своих кабинетов».

Вскоре стало ясно, что выходить из кабинетов не торопились. Всё бы ничего, но к этому времени получать очередной миллиардный кредит стало очень непросто. За свои кредиты и ресурсы Запад ожидал от Беларуси проведения экономических реформ, а Россия — военного сотрудничества и участия в распродаже белорусской собственности. Проблемы нарастали, и не замечать растущие долги и убытки не было уже никакой возможности. Выступая в апреле 2005 года в парламенте, Лукашенко обозначил новую стратегическую задачу — экономия и повсеместное внедрение режима энергосбережения. Разумеется, «экономить должны все — и предприятия, и население».

Экономить должны все, но не экономили. Не зря через два года появляется президентская Директива № 3 под красноречивым названием «Экономия и бережливость — главные факторы экономической безопасности государства». Директива констатировала, что «в стране не создана целостная система экономии материальных ресурсов». Более того, «энергоёмкость валового внутреннего продукта у нас в полтора-два раза выше, чем в развитых государствах со сходными климатическими условиями и структурой экономики». Высока «материалоёмкость отечественной продукции», «недостаточно полно используются вторичные ресурсы и отходы производства».

Мы цитируем документ 2007 года не для того, чтобы напомнить о нём, а чтобы показать, что Год бережливости можно и нужно было объявлять уже тогда. Например, сейчас «Советская Белоруссия» с осуждением сообщает: «Сбор вторсырья организован из рук вон плохо» («СБ» - 10.1.2013). Спрашивается, что же вы делали столько лет подряд, если ситуация требовала решения и в 2003-м, и в 2005-м, и в 2007-м? Получается, дожидались специального Года бережливости, чтобы запоздало объявить людям: «мы должны научиться многому»…

Александр ВЛАД

НІСЭПД: АМАЛЬ ТРАЦІНА БЕЛАРУСАЎ ЧАКАЕ ПАГАРШЭННЯ СІТУАЦЫІ



Віленскі Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў у снежні 2012-га правёў апытанне грамадскай думкі.

Яно прысвечанае важнейшым праблемам жыцця беларусаў. Амаль траціна грамадзян Беларусі (29,7%) лічаць, што сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў краіне ў бліжэйшай будучыні пагоршыцца, 23,3% апытаных спадзяюцца, што сітуацыя палепшыцца.

Як паведамляе БелаПАН са спасылкай на даследаванне НІСЭПД, тая ж траціна рэспандэнтаў сказала, што "ніякіх поспехаў у беларускай эканоміцы няма", яшчэ 28,4% — што "калі б не расійская дапамога, ніякіх поспехаў беларускай эканоміцы не было б", і толькі 28,1% лічаць, што "поспехі беларускай эканомікі тлумачацца ўнутранымі прычынамі".

Прайшло ўжо даволі шмат часу з дня “выбараў” дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, аднак ёсць людзі, для якіх гэта падзея застаецца хвалюючай. Газета “Паходня” раней ужо прадастаўляла свае старонкі для выказвання пазіцыі наконт “выбараў” былому кандыдату ў дэпутаты ад Партыі БНФ Рыгору Кастусёву, зараз звярнулась з просьбай надрукаваць нататкі на тэму “выбараў” іншы кандыдат у дэпутаты па нашай Шклоўскай выбарчай акрузе № 90 – прадстаўнік партыі “Справялівы свет” Зінаіда Мілешчанка. Мы можам падзяляць, альбо не падзяляць яе пазіцыю, аднак выказаць свой пункт гледжання на старонках “Паходні” яна мае магчымасць заўсёды, як і ўсе іншыя чытачы нашай газеты. Дарэчы, як і дзеючы дэпутат Палаты прадстаўнікоў па нашай акрузе Аляксандр Агееў, калі гэта ён сам пажадае. Застаецца толькі нагадаць чытачам “Паходні”, што мы з самага пачатку заклікалі задумацца, ці патрэбна ўдзельнічаць у “лахатроне” пад назвай выбары, калі іх вынікі былі вызначаны задоўга да пачатку выбарчай кампаніі. Аднак кожны дарослы чалавек мае права вучыцца на ўласных памылках…

ПОСЛЕ ДРАКИ КУЛАЛАМИ НЕ МАШУТ…

ПРОШЛО ТРИ МЕСЯЦА ПОСЛЕ ТОГО, КАК ПРОШЛИ ВЫБОРЫ В ПАЛАТУ ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ НАЦИОНАЛЬНОГО СОБРАНИЯ. Я БЫЛА ОДНИМ ИЗ КАНДИДАТОВ ОТ ПАРТИИ ЛЕВЫХ «СПРАВЕДЛИВЫЙ МИР» И ОБЩЕСТВЕННОГО ДВИЖЕНИЯ, ЕСЛИ ЕГО МОЖНО ТАК НАЗВАТЬ, «ГОВОРИ ПРАВДУ». ИСПОЛЬЗУЯ МЕНЯ, ОНИ ДЕЛАЛИ СЕБЕ РЕКЛАМУ. К СОЖАЛЕНИЮ, Я НЕ СРАЗУ ПОНЯЛА, ЧТО МЕНЯ МОГУТ НЕ ТОЛЬКО БРОСИТЬ ВО ВРЕМЯ ПРОВЕДЕНИЯ КОМПАНИИ, НО И ВЫБРОСИТЬ ПОСЛЕ.



Зинаида Милещенко

Нет, я не разочаровалась, как это показалось г-же Самойловой Оксане, в оппозиционном движении. Как поступает руководство партий и всяческих движений в нашей стране с отработанным на данном этапе «материалом», т.е. с теми, кто пытается быть честным и принципиальным, последовательным в работе с, пока что, населением нашей страны, так как назвать народом жителей Беларуси ещё трудно, я знаю. Меня это не удивляет. Меня это уже даже не злит. Более десяти лет я не в борьбе, как многие, а в работе. Я стараюсь помогать людям бороться с бюрократизмом, консультирую их по многим важным для них вопросам, просто выслушиваю и утешаю. Я уже была депутатом районного Совета. Я знаю, что значит быть одинокой и принципиальной.

Нет, я не верила в то, что я пройду в Палатку. И знала почему! Но ведь речь и не шла о том, что мы, кандидаты, станем депутатами. Ведь наши лидеры убедили нас в том, что предвыборное время – это самое лучшее время работы с избирателями. Что это едва ли не единственная возможность легально встретиться с людьми, на них «посмотреть и себя показать». Так почему же тогда меня, которая откликнулась на этот призыв, не смотря на трудности и риск (ведь у меня дети), не смотря на проблемы со здоровьем (я человек уже не молодой), меня предали, я так считаю, не обеспечив материально хотя бы транспортные расходы. Не предоставив мне юридическую помощь. Почему вообще не был создан штаб при руководстве партии, который бы помогал кандидату работать во время выборов. У меня остался вопрос: это было только по отношению ко мне, или по всей стране в течение многих лет вся, почти, оппозиция «пляшет под дудку» нашего великого «драматурга»? Господа, хватит искать дураков, которые будут зарабатывать вам гранты, чтобы вы, в общем-то, безбедно жили. Могу сразу сказать, я больше в эти игры не играю! Меня уже тошнит от этой конспирации, от того, что мне пришлось, как во время ВОВ называть деньги «огурцами». Я ещё не страдаю старческим маразмом.

Во время встреч с людьми мне задавали вопросы, которые я сейчас самостоятельно, как всегда, пытаюсь людям помочь решить. А ведь этих вопросов было бы намного больше, если бы я объехала все участки и встретилась с большим количеством наших граждан. Сколько бы мы привлекли на свою сторону людей! Скольким бы показали, что оппозиция – это не какие-то «отморозки», а нормальные люди, умеющие слушать, слышать и понимать. И решать!!!

Если господа лидеры партий и движений считают провинцию пустяшной, не стоящей их внимания территорией, то они глубоко ошибаются. Ноги, извините меня за выражение, всё-таки растут из задницы. И вот в этой заднице вы, господа, и сидите. Потому что в нашей стране даже те люди, которые уже много лет живут в городах, по своему менталитету являются людьми сельскими. И чтобы понять, что происходит в стране, надо хорошо знать, чем живёт провинция.

Почему мы проиграли очередные выборы? А мы их проиграли, потому что в основном люди голосовали за представителей всё-таки властных структур. И потому что человек привык думать о завтрашнем дне. Не о далёком будущем, и даже не о послезавтра, а именно, о завтра.

(Начало. Оконч. на стр. 5)

ПОСЛЕ ДРАКИ КУЛАЛАМИ НЕ МАШУТ…

(Оконч. Начало на стр. 4)


А завтра, люди знают, будет Лукашенко, будет его «команда», и оппозиция, с её разобщёнными поредевшими после каждой неудачи и поражения рядами, не в состоянии не только решить их проблемы, но и просто даже принимать решения в управлении страной. В наших рядах нет почти людей, которые бы мыслили по государственному. А люди уже от колхоза устали. Потом, проигравших не любят. И не верят им. А мы много лет подряд проигрываем режиму.

ОГП выпустила листовку, «МЫ МОГЛИ БЫ БЫТЬ ВАШИМИ ДЕПУТАТАМИ». Да не могли, господа! Не верю я, что за вас голосовало большинство! Конечно, произошёл большой «вброс» бюллетеней за властных кандидатов. Люди не хотели идти на выборы. И если бы оппозиция не подыграла опять Лукашенко, не стала бы участвовать в этом фарсе, было бы всё намного интересней. Ведь многих к голосованию привлекло именно наше участие. Без участия оппозиции явка была бы ещё меньше и власть имущие это бы знали. Но, как я поняла, так как для многих лидеров и более мелких фигур оппозиции, выборы – это единственная возможность пополнить карман валютой, то интересы народа уже для них, - не столь важная задача.

Господа из партии «Справедливый мир» и «Говори правду»!

Вы знаете, что я ощущала после выборов? Я долго над этим думала. Боль уже ушла. Обида прошла. Стыд перед людьми, которые мне верили и за меня голосовали, сменился признательностью за их позицию. Спасибо всем, кто в меня верил! Простите те, что ждали меня и не дождались. Я не смогла к вам приехать из-за недостатка денег. Мне жаль, что я не смогла с вами встретиться.

Господа, которых я считала соратниками! Что я чувствовала по отношению к вам? Я вам отвечу вопросом!!! Что чувствует порядочная женщина, которую как проститутку, использовали в своих целях, не обеспечив комфортом и не заплатив? Вот, приблизительно, то самое я чувствовала в конце выборов и после. Ведь я, как она, отработала «за трояк и под лестницей». А если серьёзно, то я «платила клиентам ещё и со своего кармана». К тому же была унижена г-жой Самойловой О., которая почему-то посчитала себя моим работодателем. И скрупулёзно пыталась подсчитать не мои расходы на избирательную компанию, а «заработную плату», посчитав, что 800000 рублей достаточно за «мой труд», правда, пообещав вначале больше, из-за чего я влезла в долги и до сих пор пытаюсь рассчитаться с людьми, которые на меня работали во время выборов. А пенсия у меня скромная, так как, связав свою жизнь с оппозицией, я была безработной 8 лет. И за это пресловутое время не получила от оппозиции ни рубля помощи. Ни на жизнь, ни на лечение после побоев работником милиции, ни на депутатскую работу.



Я оказалась более стойкая и мудрая, чем Полякова, которая покончила с собой. Я уступила власти после трёх лет борьбы в одиночестве, потому что почувствовала, что ко мне на помощь никто не придёт. Пошумят и бросят.

Прочитала в интернете, что «Говори правду» готовится к выборам в местные советы. Это бег на месте! Кому это нужно? Вам? Сомневаюсь. Ну, если только для того, чтобы поездить за границу. Народу? Вы на фиг ему не нужны. В ваших рядах слишком много случайных людей, которые отпугивают население от ваших идей. Успокойтесь! Власть Лукашенко упадёт сама по себе. Без нашего участия. По законам экономики и политики. Страшно одно: кто её подберёт? Дай Боже, чтоб не очередной авантюрист.

Я вспоминаю свою поездку во время СССР в Нагорный Карабах. Мы, с тогда ещё малолетним сыном, ехали из Степанакерта, столицы области, в город Шуша, единственный город в Азербайджане, который не смог захватить великий завоеватель Хромой Тимур. Конечно, расположение города помогало защитникам держать осаду, но ведь голод иногда вынуждает идти «на компромисс». Они выдержали, и город не сдали. Я до сих пор преклоняюсь перед их подвигом.

Но ещё более интересное я увидела по дороге на Шушу. В долине реки с правой стороны паслось большое стадо овец. А с левой стороны дороги была бойня скота. И водил овец на бойню огромный, по козлиным меркам, козёл. Он врывался в стадо, оббежав пару раз по кругу часть стада, и бежал через дорогу в бойню, увлекая обречённых овец за собой. Получал там, как мне объяснили, свой кусок хлеба, и выбегал с обратной стороны сарая за новой партией овец. Почему-то очень часто мне приходит на ум это сравнение. Чем-то жизнь в нашей цветущей Беларуси напоминает мне эту придорожную остановку. Но только больше я не поверю ни одному козлу!!!

Выборы прошли…. Но народ ещё сделает свой выбор. Пока что он в осаде…. И мужественно выживает.

Зинаида Милещенко

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

БУДЕМ ЛИ МЫ СЧАСТЛИВЫ В 2013 ГОДУ?

Если честно, то 2012 год выдался скучным и, пожалуй, самым неинтересным за все годы правления А.Лукашенко. К нищете народ привык, вороватые чиновники почти все на свободе, доведенные вышестоящими учреждениями власти рубежи успешно перевалены. Только не все так радужно, как кажется на первый взгляд, и не все так перспективно, как рисует официальная пропаганда.

К сожалению, Беларусь традиционно является одной из самых отсталых стран Европы и по итогам года занимает предпоследнее место в списке европейских государств, обойдя в экономической гонке только Украину. Попытки власти представить результаты своего правления в положительном свете не убедительны - в рейтинге экономически свободных стран, составленном фондом Heritage Foundation и экспертами Wall Street Journal, .Беларусь заняла 154 место из 177 стран мира, заметно ухудшив этот показатель по результатам 2012 года. Из-за сохранения государственного контроля практически во всех сферах белорусская экономика получила статус “репрессивной”, что естественным образом учитывается иностранными инвесторами.

Внешний государственный долг Республики Беларусь уже превысил 12 млрд. долларов США, при чем, как раз на 2013 год приходится пик выплат по внешнему долгу – 3,1 млрд. долларов США. А это почти в 2 раза выше объемов выплат в 2012 году, при этом источников для его погашения у белорусских властей практически нет. Объем золотовалютных резервов государства в 8 млрд. долларов США вряд ли вызывает оптимизм у чиновников Министерства финансов и Национального банка, которые в первую очередь должны быть озабочены эффективностью размещения внешних заимствований. Но, пока должным образом это не получается ввиду их нерационального использования.

Поставленная Президентом задача по наращиванию объемов экспорта в принципе и должна решать проблемы белорусской экономики и своевременности расчетов с внешними кредиторами, но положительное сальдо от внешнеэкономической деятельности до такой степени мизерно, что с этой задачей нынешнее руководство страны явно не справляется. Да и может ли оно справиться, если импортоемкость белорусской экономики «перевалила» за 70%, а более половины экспортной выручки формируют всего 3 предприятия – 2 нефтеперерабатывающие заводы и «Беларуськалий». На этом фоне констатируется все возрастающая зависимость Беларуси от настроения российской элиты и еще в большей степени ставит под сомнение возможность переориентации экономики на инновационный путь развития.



Отсутствие структурных реформ негативным образом сказывается на реальном секторе экономики, на непроизводственной сфере, провоцирует высокий уровень коррупции и снижает уровень социальной защиты населения. Бизнес по-прежнему работает в строго отведенных границах и бурно развивается только у «придворных» олигархов. В тоже время ряд крупных бизнесменов лишились не только собственности, но и свободы, многие предприниматели перенесли свой бизнес в Россию, Польшу и Литву.

2012 год поставил ряд вопросов перед обществом и руководством страны. Например, почему при таких объемах инвестиций промышленность за прошлый год увеличила убытки в 3 раза, почему не сработала программа по энергосбережению и правительство вынуждено доводить госсектору задания по снижению энергозатрат? Насколько эффективен экспорт сельскохозяйственной продукции в Россию, если практически всю продукцию мы продаем ниже себестоимости? До каких пор строительная отрасль будет терять квалифицированные кадры, которые государство готовит, а работают они в других странах? И таких вопросов по любому направлению деятельности наших руководителей не счесть.

К сожалению, нарастают проблемы и в финансовой сфере: увеличился спрос на валюту со стороны физических и юридических лиц, коммерческие банки все в большей степени ощущают дефицит рублевых ресурсов, что вынудит Правительство в еще большей степени накачивать экономику эмиссионными деньгами.

(Начало. Оконч. на стр.7)

БУДЕМ ЛИ МЫ СЧАСТЛИВЫ В 2013 ГОДУ?

(Оконч. Начало на стр. 6)

По-прежнему высока стоимость кредитов в условиях неэффективного ведения хозяйства государство будет вынуждено компенсировать их возврат и оплату за счет бюджета, что в еще большей степени усугубит положение слабо защищенных слоев населения. Эстафету проблем в социальной жизни белорусов мы уже ощущаем - не от хорошей ведь жизни Правительство перенесло повышение пенсий на неопределенный срок, а существующие пособия по уходу за ребенком и по безработице на уровень ниже, чем у тех же россиян, над которыми так любит потешаться наш президент. Неприятный сюрприз принес новый год и для ветеранов-афганцев, которых лишили льготных кредитов на жилье.

Инфляция в Беларуси по итогам года составила 21,8% (в России – 6,6%), но и реальная зарплата вплотную приблизилась к 500 долларам США в эквиваленте, далеко оставив позади по темпам роста производительность труда. Пагубность данного соотношения белорусы ощущают практически все годы правления А.Лукашенко и ситуацию можно в данном случае прояснить перефразированной известной поговоркой – самый дорогой сыр в мышеловке – за него нужно платить жизнью. Вот мы и платим – низкими доходами, засильем бюрократов, наглостью власти. Не потому ли уровень инфляции в Беларуси снова самый высокий в Европе и серьезных предпосылок для ее тотального снижения не наблюдается, а это значит, что и будущий год от роста цен население защищено не будет. К сожалению (обращаю внимание только на один показатель), в рекордсменах по росту цен услуги высшего образования – увеличение на 68% (здесь и качество обучения, и доступность образования для талантливой молодежи из малообеспеченных семей), да и в целом сфера услуг дала прирост более 36%.

В 2013 году для обеспечения достойной жизни чиновников (рядовым гражданам, как правило, остаются



крохи от ломтя черного хлеба) вся ставка на российское понимание ситуации – дадут 23 млн. тонн нефти на переработку – будут жить. А если не дадут? Народ-то выкрутится, но для режима вопрос ведь не праздный. С растворителями-разбавителями россияне разобрались (шикарный был ход), цены на калий падают, торговые связи укрепляются в большей степени со странами «третьего мира», расстояния до торговых точек удлиняются, эффективность внешнеэкономических отношений падает.

Но, пожалуй, самое неприятное, с чем придется столкнуться нашему обществу – нехватка рабочей силы. Причины разные: демографическая ситуация, миграция, потеря квалификации у специалистов основных рабочих профессий. Недооценка данной перспективы может привести к разрушению государства – уезжают ведь наиболее квалифицированные, а Китай, Вьетнам, Таджикистан свои высококвалифицированные кадры сюда не пришлет. Россия, конечно, поможет, но и для сердобольной соседки очень скоро груз белорусских проблем окажется непосильной ношей, а наши чиновники может в конце концов поймут, что валюту зарабатывать можно в ближнем европейском зарубежье в западном направлении и не ходить около Кремля с протянутой рукой, торгуя суверенитетом. На счастье это пока не тянет

Существует мнение, что Лукашенко с челядью использует белорусский народ. Это, по-моему, заблуждение – просто народ пока использует всю эту челядь в своих интересах, но сегодня интересы чиновника явно перевесили чаяния народные. А это очень опасно для непонимающих, когда к тебе ночью постучат в окно и не с целью попросить кусочек хлеба. 2013 год все-таки на дворе.

Пётр Мигурский, к.э.н., доцент

МАГІЛЁЎСКІЯ ПЕНСІЯНЕРЫ ДЗЕЛЯ ЭКАНОМІІ ЎКЛЮЧАЮЦЬ ТОЛЬКІ ХАЛАДЗІЛЬНІК?

Людзям удаецца выпаліць не болей за 40 кілават у месяц. Гэта ў тры разы меней, чым у сярэднім паліць сям'я, што стараецца эканоміць.

“У мяне ў кватэры настолькі святла хапае ад ліхтароў, і заднаго боку, і з другога — у мяне столькі святла, што дзе лішняе, я не ўключаю”, — кажа пенсіянерка з Магілёва Елізавета Фёдараўна. За месяц у жанчыны нагарае не болей за 40 кілават-гадзін. Да прыкладу, сучасны халадзільнік за месяц выпальвае менавіта 30-40 кілават.

Ці будзе ўводзіцца ліміт на электраэнергію, Еўрарадыё ў Мінэнерга адказаць не могуць нават сёння — канчатковага рашэння няма. Тут спрачаюцца: уводзіць ліміт не болей за 150 кВт/гадзін ці паступова павышаць кошты на энергію. Магілёўская пенсіянерка паліць амаль у чатыры разы меней.

А вось у Магілёве да Году

(Пачатак. Заканч. на стар. 8)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

УВАГА - КОНКУРС!

ГА “Саюз беларускіх пісьменнікаў” і Беларускі ПЭН-цэнтр з 1 студзеня 2013 года абвяшчаюць пра пачатак прыёму твораў на конкурс маладых пісьменнікаў “Экслібрыс” імя Янкі Маўра. У 2013 годзе споўніцца 130 гадоў з дня нараджэння вядомага дзіцячага пісьменніка. А таму сёлета тэмай конкурсу абраная дзіцячая літаратура.

Да разгляду конкурснага журы будуць прымацца творы для дзяцей у наступных жанрах: проза (апавяданні, казкі і г.д.), паэзія (вершы, байкі і г.д.), п’есы, тэксты песень, коміксы, пераклады замежных дзіцячых твораў на беларускую мову.

Асаблівая ўвага будзе нададзеная:

* творам для падлеткаў;
* творам, у якіх апісаны цікавы сучасны вобраз героя/гераіні;
* творам з надзвычай арыгінальным сюжэтам;
* творам у незвычайных для беларускай літаратуры жанрах: комікс, графічны раман і г.д.;
* творам, якія пераасэнсоўваюць сюжэты і герояў класічных дзіцячых твораў.

Узяць удзел у конкурсе могуць пісьменнікі, літаратурныя крытыкі і перакладчыкі не старэйшыя за 40 гадоў.

Журы конкурсу:

Алена Масла;
Людміла Рублеўская;
Алесь Пашкевіч;
Пятро Васючэнка;
Серж Мінскевіч.

Тэксты на конкурс можна дасылаць да **1 жніўня 2013** на адрас sbp@litbel.org, пазначыўшы тэмай ліста “Конкурс”. У лісце мусіць быць інфармацыя пра імя, прозвішча, дату нараджэння ўдзельнікаў, іх кантактныя нумары тэлефонаў і e-mail.

Па выніках літаратурнага конкурсу пройдзе вечарына ўзнагароджання, творы пераможцаў будуць надрукаваныя ў часопісе “Дзеяслоў” і газеце “Літаратурная Беларусь”, а іх саміх запросяць на літаратурны пленэр. Найлепшыя творы, дасланыя на конкурс, могуць выйсці асобнай кнігай.

ЗА 2 ГАДЫ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ АГРАСЯДЗІБАЎ СТАЛА МЕНШ НА ЧВЭРЦЬ

Калі ў 2010 годзе іх было 270, то ў 2012-м засталося толькі 201.

Спецыялісты кажуць, што аграсядзібаў стала менш, бо іх уладальнікі не змаглі атрымаць ільготныя крэдыты, на якія разлічвалі.

Найбольш эфектыўныя напрамкі агратурызму развіваюцца ў Магілёўскім, Бабруйскім і Быхаўскім раёнах. Станоўчую ролю ў гэтым адыгрывае блізкасць буйных гарадоў, паведамляе “Радыё Магілёў”.

Byfly і Zala падаражэлі яшчэ на 10%

У дадатак да падаражэння на 20% з пачатку года. Кампанія «Белтэлекам» з 18 студзеня 2013 года павялічыла свае тарыфы ў сярэднім на 10%. Змены закранаюць паслугі па прадастаўленні інтэрнэту, лічбавага тэлебачання і тэлефоннай сувязі.

Новыя дакладныя тарыфы яшчэ не агучаныя. Аднак калі перад 1 студзеня безлімітны доступ да інтэрнэту «Дамасед» на хуткасці 1 Мб/с каштаваў 59 400 рублёў, то пасля 18 студзеня будзе каштаваць каля 78 тысяч рублёў.

Фактычна рост цаны дасягне 32%.

МАГІЛЁЎСКІЯ ПЕНСІЯНЕРЫ ДЗЕЛЯ ЭКАНОМІІ ЎКЛЮЧАЮЦЬ ТОЛЬКІ ХАЛАДЗІЛЬНІК?

(Заканч. Пачатак на стар. 7)



беражлівасці рыхтаваліся яшчэ тры гады таму. З ініцыятывы Магілёўскага гарвыканкама тут праводзілася гульня “Эканомія электраэнергіі ў быце”. Удзельнікі мусілі паказаць самыя маленькія паказчыкі па ўжыванні электраэнергіі за год. За гэта самым эканомным давалі грашовую прэмію.

Супрацоўнікі магілёўскага Інфармацыйна-кансультацыйнага цэнтра па энергазберажэнні кажуць, што ўдзельнікі эканомілі да абсурду:

“Адна пажылая пара, якія сядзелі ў цемры, тэлевізар не глядзелі, слухалі радыё. Хадзілі глядзець тэлевізар да дачкі, там жа і прасавалі. У іх ці не 4 кілават-гадзіны за год мо было. Гарвыканкам, канечне, іх узнагародзіў. Але гэта ўсё больш падобна да кроку назад у развіцці”.

Як даведалася Еўрарадыё, дзеля перамогі магілёўцы прасавалі не электрычнымі прасамі, а… на вуглях! І нават абкладвалі халадзільнік ватай!

“…маўляў, калі без ваты — халадзільнік аддае цяпло, а калі яго ватай абкласці — тады ён будзе лепей зберагаць холад. Хаця я асабіста думаю, што гэта лухта”, — кажа спецыяліст Магілёўскага цэнтра па энергазберажэнні.

У самім Цэнтры таксама пачалі эканоміць — выключаюць маніторы падчас абедзеннага перапынку і зусім выключаюць камп’ютарную тэхніку, нават з рэжыму чакання, пасля сыходу з працы.

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна

Адрас рэдакцыі: Бялыніцкі раён, в. В.Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 15.01. 2013 г. у 18-00.